пасля пачатку вайны дзеянні іракскіх войскаў прывялі да разліцця 6-8 млн. барэляў кувейцкай нафты ў воды Персідскага заліва. За 4 дні бамбардзіровак Ірак падарваў большую частку з 1250 нафтавых свідравін Кувейта, у выніку чаго ўзніклі пажары на амаль 600 нафтавых свідравінах і былі заліты нафтай вялізныя плошчы краіны. Савет Бяспекі ААН у рэзалюцыі №687 ад 3 красавіка 1991г. пацвердзіў адказнасць Ірака перад замежнымі дзяржавамі, фізічнымі і юрыдычнымі асобамі за шкоду, нанесеную навакольнаму асяроддзю, і за знішчэнне прыродных рэсурсаў у выніку ўварвання ў Кувейт. У адпаведнасці з гэтай рэзалюцыяй быў створаны фонд, сродкі ў які павінны паступаць ад Ірака ў суме, якая складае каля чвэрці яго гадавых даходаў ад здабычы нафты. Гэтыя сродкі прызначаліся для пакрыцця шкоды, які, паводле ацэнак, дасягала 59 млрд. долараў.

Рэакцыяй дзяржаў у адказ на негатыўныя наступствы ўзброеных канфліктаў павінны быць нормы міжнароднага права аб абароне навакольнага асяроддзя, якія трэба ўдасканальваць і строга выконваць. Гісторыя распрацоўкі інстытута міжнародна-прававой абароны навакольнага асяроддзя ва ўмовах ўзброенага канфлікту сёння ўжо налічвае больш за 100 гадоў.

Несумненна, у сучасным свеце існуе праблема замацавання адказнасці дзяржаў за экалагічныя злачынствы. Існуе шмат прававых актаў, дзе забараняюцца экалагічныя правапарушэнні, але мала ў якіх прававых актах прапісваецца міжнародная адказнасць за вышэйзгаданныя дзеянні. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што сістэма прававых актаў, створаная для барацьбы з экалагічнай злачыннасцю і яе прадухілення, мае патрэбу ў дапрацоўцы і ўдасканальванні: неабходна больш дэтальна і дакладна прапісваць формы і меры міжнароднай прававой адказнасці дзяржаў за шкоду, прычыненую навакольнаму асяроддзю.

## ЗМЕНЫ Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ, ЯКІЯ РЭГУЛЯВАЛІ АПЕКУ І ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

**Батвінка М.У.**

*БДЭУ (Мінск)*

Шмат часу прайшло з заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, але кожны памятае пра падзеі гэтых жудасных часоў.

“Усё павінна быць падпарадкована інтарэсам вайны” - гэтым палажэннем савецкая дзяржава кіраваліся ва ўсёй сваёй дзейнасці ў гады вайны, у перабудове гаспадаркі, дзяржаўнага аппарату, а таксама ў заканадаўчай сферы. Вялікая Айчынная вайна ўнесла значныя сур’ёзныя змены ў рад інстытутаў савецкага права. Такія змены адбыліся і ў сямейным праве. Удасканаленне сямейнага права праводзілася з мэтаю ўмацавання інстытута шлюбу, заахвочвання сямей, а таксама ўзмацнення пазіцыі інстытута апекі і папячыцельства.

У той час разварочваўся патрыятычны рух з мэтай аказання дапамогі дзецям у формах патранату, апекі і папячыцельства. Апека і папячыцельства як традыцыйны спосаб абароны правоў дзяцей, якія страцілі бацькоў, працягвала існаваць, нягледзячы на ўсе цяжкасці. Вайна прынесла няшчасце амаль у кожную сям'ю, шмат дзяцей у гэты час страцілі сваіх бацькоў. Савецкая дзяржава ажыццяўляла функцыі па ўладкаванню дзяцей, якія страцілі бацькоў, у дзіцячыя выхаваўчыя ўстановы, дзіцячыя дамы, інтэрнаты, у суворaўскія ваенныя вучылішчы.

У час вайны дзяржава шукала шматлікія матэрыяльныя сродкі дзеля заахвочвання тых сямей, якія ўзялі на сябе адказнасць за выхаванне асірацелых дзяцей. Патранат з'яўляўся сродкам барацьбы з дзіцячай беспрытульнасцю і безнагляднасцю. Спыняўся патранат па патрабаванню бацькоў ці іх родных, якія знайшлі дзяцей. Вынікаючыя з дагавора аб патранаванні адносіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны рэгуляваліся Пастановай ЦВК і СНКБССР ад 6 студзеня 1938г. "Аб парадку передачы дзяцей на выхаванне (патранат) сем'ям працоўных".

Апека ўстанаўлівалася над непаўналетнімі дзяцьмі, якія засталіся без бацькоў. Апякун не меў правоў здзяйсняць без згоды органаў апекі здзелкі, звязаныя з адчужэннем маёмасці падапечнага.

Асобае значэнне меў інстытут усынаўлення ў БССР, дзе пасля Вялікай Айчыннай вайны было зарэгістравана 90 тысяч дзяцей, якія страцілі бацькоў. Згодна Указу Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 верасня 1943 года "Аб усынаўленні", усынавіцелі мелі права па іх просьбе быць запісаны ў актавыя кнігі як бацькі ўсынаўляемых. Усынаўленным, па просьбе усынавіцеляў, прысвойвалася прозвішча і імя па бацьку па імені усынавіцеля. Для ўсынаўлення дзяцей, якім мінула дзесяць год, патрабавалася іх згода.Такім чынам захоўвалася таямніца ўсынаўлення не толькі для дзяцей, але і для іншых асоб, і ўсынаўлёныя дзеці цалкам раўняліся з дзяцьмі ўсынавіцеля. Дадзены Указ усталяваў правы і абавязкі як асабістага,так і маёмаснага характару паміж усынаўленным і яго патомствам з аднаго боку і родзічамі ўсынавіцеля з другога. Гэтыя змены былі ўключаны ў Кодэкс законаў аб шлюбе,сям'і, апеке БССР.

Змены ў сямейным праве, якія адбыліся ў гады вайны, былі вызваны і ўскораны ўмовамі таго часу. Шэраг мераў, якія былі праведзены ў гады вайны, напрыклад: аказанне дзяржаўнай дапамогі беспрытульным дзецям, заахвочванне сямей, якія ўзялі апеку над сіротамі – характарызуюць агульны заканамерны працэс развіцця савецкага грамадзянскага і сямейнага права, які вайна не здолела спыніць.Вялікая Айчынная вайна змяніла некаторыя нормы сямейнага права ў кантэксце апекі і папячыцельства,але не парушыла галоўных яго прынцыпаў і асноў.